финансовую помощь. В 1914 г. под опекой Минского отделения находилось 325 таких учреждений, но размеры их финансовой поддержки были скромными[1].

Таким образом, открытие Минского отделения Государственного банка было насущной необходимостью экономического развития белорусского региона. Значение его деятельности как кредитного учреждения и регулятора промышленной, финансовой жизни края в 80-е годы XIX – начале XX в. постепенно возрастало. Однако политика банка в белорусских губерниях носила не совсем последовательный характер. С одной стороны, Госбанк расширял возможности получения кредита для местных предпринимателей, с другой – ставил границы их развитию. Поэтому финансовые операции Минского отделения охватывали лишь часть торгово-промышленного оборота губернии.

В 1914 г. численность служащих Минского отделения превышала 56 чел. В штате отделения находились инспектор мелкого кредита, торгово-промышленный и учетно-ссудный комитеты. В условиях активизации боевых действий Первой мировой войны на территории Беларуси отделение было эвакуировано в Казань. Официальное закрытие Минского отделения Государственного банка произошло в начале 1919 г., когда на основании Декрета ВЦИК РСФСР от 14 декабря 1917 г. «О создании единого Народного банка Советской Республики» оно было реорганизовано в Минскую окружную контору Народного банка РСФСР.

*С. В. Мяньчэня (Мінск, Беларусь)*

## НАРОДНЫЯ ЧАЙНЫЯ МІНСКА: СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

Стварэнне народных чайных стала адным з кірункаў дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі па рэалізацыі «віннай манаполіі» і распаўсюджвання сярод насельніцтва ідэй памяркоўнага спажывання алкагольных напояў. Народная чайная павінна была прыйсці на месца карчмы і стаць не толькі пунктам харчавання, але і выконваць значныя сацыяльныя функцыі.

Карчма для насельніцтва была не толькі месцам, дзе можна выпіць, але і, фактычна, адзіным месцам, дзе можна было правесці вольны час, пагутарыць, дзе, часам у адрозненні ад дома, людзі знаходзілі чысціню і камфорт, таму гэтым жа крытэрыям павінны былі адпавядаць і чайныя. Чайная, акрамя арганізацыі продажу напояў і закусак, павінна была стаць месцам здаровага і карыснага адпачынку, дзякуючы настольным гульням, газетам і народным чытанням. Планавалася, што ў выпадку паспяховай дзейнасці дзяржаўныя чайныя статуць фінансава самастойнымі ўстановамі і не будуць залежаць ад дзяржаўнай падтрымкі і прыватных ахвяраванняў, што павінна было прывесці

[1] Памятная книжка Минской губернии на 1915 год. Издание Минского губернского статистического комитета. Минск, 1914. С. 67.

да з'яўлення і прыватных чайных. Як вынік, распаўсюджанне спажывання гарбаты павінна было прывесці да скарачэння спажывання алкаголя[1]. Аднак на практыцы арганізацыя чайных сустрэла пэўныя цяжкасці.

Арганізацыя чайных на тэрыторыі Беларусі пачалася ў 1897 г. пасля распаўсюджвання на заходнія губерні «віннай манаполіі» і стварэння камітэтаў папячыцельства аб народнай цвярозасці. Першапачаткова іх колькасць у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях склала каля 500. Аднак размяркоўваліся яны не раўнамерна – у Магілёўскай губерні налічвалася каля 120 народных чайных, у Віцебскай – 50[2]. У Мінскай губерні ў 1905 г. налічвалася 44 адпаведныя ўстановы[3]. У далейшым з-за фінансавых цяжкасцей народныя чайныя пачалі ліквідавацца. У 1907 г. у Мінскай губерні засталося 22 чайных, Віленскай – 24, Віцебскай – 26, Магілёўскай – 31, Гродзенскай – 32[4].

Асноўнай мэтавай аўдыторыяй лічыліся прадстаўнікі «простага народу» – сяляне і рабочыя. Меркавалася, што заможныя людзі маюць магчымасць піць гарбату дома і ў чайную дзеля гэтага не пойдуць. З гэтай нагоды, найбольш прымальным месцам для чайнай у горадзе і мястэчку лічылася гандлёвая плошча. У выпадку, калі чайная размяшчалася нават на суседняй вуліцы, тут назіралася рэзкае скарачэнне колькасці наведвальнікаў, у выніку чаго чайная цярпела вялізныя страты[5].

Само памяшканне чайнай павінна было дзяліцца на кухню, буфет, памяшканні для наведвалькаў (белае і чорнае), асобныя памяшканні для пражывання сядзельцаў (адміністратараў) і прыслугі, калі яна мелася. Белае памяшканне прызначалася для больш заможных кліентаў, чорнае – для маламаёмасных, акрамя таго, тут дазвалялася курыць. Аднак на практыцы, чайныя часцей размяшчаліся ў памяшканнях, дзе такі падзел быў немагчымы.

Асобна вызначаўся і інтэр'ер памяшкання. Аклейка сцен шпалерамі лічылася надта непрактычнай з'явай, бо яны дастаткова хутка забруджваліся, што надавала памяшканню занядбаны выгляд. Найбольш мэтазгодным лічылася пабелка сцен і фарбаванне панэляў. Сталы рэкамендавалася накрываць абрусам толькі ў белай частцы, астатнія ці аббіваліся цыратай, ці фарбаваліся пераважна ў шэры колер[6]. На сценах віселі абразы, партрэт імператара і карціны рознага зместу.

Наведваць чайную мог кожны з мэтай адпачыць, абагрэцца, схавацца ад дажджу, пры гэтым плата з яго не ўзымалася, а персанал чайнай не мог пера-

---

[1] Значение чайных в борьбе с алкоголизмом. Санкт-Петербург, 1903. С. 13.

[2] *Маньчэня С. В.* Арганізацыя работы чайных на Беларусі ў 1897–1914 гг. (па матэрыялах Віцебскай і Магілёўскай губерняў) // Научные труды Республиканского института высшей школы: Исторические и психолого-педагогические науки: в 2 ч. Минск, 2014. Ч. 1. С. 216.

[3] НГАБ. Ф. 132. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 4.

[4] НГАБ. Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 87. Арк. 420.

[5] НГАБ. Ф. 2555. Воп. 1. Спр. 109. Арк. 27.

[6] Тамсама. Спр. 109. Арк. 27 адв.

шкодзіць гэтаму. Кожны жадаючы мог бясплатна наведаць чайную і з мэтай чытання газет і часопісаў, якія знаходзіліся тут у свабодным доступе. Перыядычныя выданні выпісваліся за кошт губернскіх і павятовых камітэтаў папячыцельства аб народнай цвярозасці. Наведвальнікі маглі азнаёміцца з мясцовымі губернскімі ведамасцямі і іншымі часопісамі і газетамі. Таксама пры большасці чайных ствараліся бібліятэкі і чытальні, якія маглі выдаваць кнігі па абанеменце на дом.

Наведвальнікі чайных павінны былі паводзіць сябе ціха і сціпла, шум і лаянка забараняліся. Калі наведвальнік быў незадаволены дзейнасцю персанала альбо якасцю прадуктаў, ён мог паскардзіцца загадчыку чайнай, ці зрабіць запіс у кнігу скаргаў[1].

Адна порцыя гарбаты ў сярэднім каштавала ад 4 да 6 кап. Для параўнання, фунт сітнага хлеба каштаваў 3 кап., а за 6 кап. можна было набыць фунт ялавічыны 2-га гатунку[2]. Наведвальнік атрымліваў два чайніка з кіпнем, 2–3 кавалка цукру і пакет з гарбатай, запячатаны загадчыкам чайнай. Прыгатаваць напой трэба было самостойна, буфетчыкам і сядзельцам заварваць гарбату кліентам катэгарычна забаранялася. Дадатковы цукар і гарбата павінны былі аплачвацца асобна. Пры гэтым колькасць кіпня і асоб на адну порцыю была неабмежавана і ў сярэднім складала 5–6 чал. Прадугледжваўся таксама і продаж чая кубачкамі за 1 кап., што было разлічана на бедных кліентаў і тых, хто не меў дастаткова часу[3].

Значную канкурэнцыю народным чайным складалі прыватныя ўстановы. У большасці сваёй гэта былі былыя корчмы, якія пасля рэарганізацыі змянілі назву, але захавалі былую сутнасць. Мінскі паліцмайстар 29 чэрвеня 1901 г. рапартаваў губернатару, што прыватныя чайныя Мінска з'яўляюцца прытонамі злодзеяў, дзе акрамя гарбаты прадавалася і гарэлка. Працоўных тут спойвалі да бяспамяцтва, ці пачыналі бойку, пад час якой чысцілі кішэні. Большасць злачынстваў заставаліся беспакаранымі, бо пацярпелыя, ці нічога раніцай не памяталі, ці проста не жадалі звяртацца ў паліцыю. Адной з такіх устаноў была чайная Моўшы Рахманчыка на вуглу Нова-Раманаўскай і Слабадской вуліц (раён перасячэння вуліц Раманаўская Слабада і Няміга). Сам Рахманчык неаднаразова прыцягваўся да адказнасці за продаж спіртных напояў і нават адбываў турэмны тэрмін[4]. Падобныя чайныя найчасцей размяшчаліся ў вуглавых дамах і мелі некалькі ўваходаў, з прычыны чаго назіраць за імі было складана. Цяжкасць складалася яшчэ ў тым, што ў выпадку выкрыцця парушэння «чайныя» не зачынялі, і нават калі гаспадара арыштоўвалі, яго працу працягвалі сваякі.

---

[1] НГАБ. Ф. 2555. Воп. 1. Спр. 113. Арк. 141.

[2] *Мяньчэня С. В.* Арганізацыя работы чайных на Беларусі ў 1897–1914 гг. (па матэрыялах Віцебскай і Магілёўскай губерняў). С. 217.

[3] НГАБ. Ф. 2555. Воп. 1. Спр. 113. Арк. 141.

[4] НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6495. Арк. 34.

У Мінску Папячыцельствам аб народнай цвярозасці былі заснаваны 2 народныя чайныя. Іх арганізацыяй займаўся гарадскі камітэт папячыцельства, які пасля 1908 г. быў аб'яднаны з павятовым. Дакументаў Мінскага гарадскога камітэта ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі фактычна не захавалася, таму пра першы перыяд існавання чайных звесткі маюцца толькі спарадычныя.

Народная чайная № 1 знаходзілася ў доме Розенгауза на Рыбным рынку (раён вул. Няміга, непадалёк ад Петрапаўлаўскай царквы)[1]. Дакладны час адкрыцця па дакументах не прасочваецца, але па аналогіі з іншымі губернскімі гарадамі, прыкладна 1897–1898 гг. Народная чайная № 2 месцілася ў доме Аляксандры Яхімовіч на Аляксандраўскай вуліцы (вул. М. Багдановіча)[2] і была адчынена не пазней 1899 г. Дадзеную выснову можна пацвердзіць тым фактам, што ў 1912 г. загадчык чайнай дакладаў, што 12 год таму ў чайную перадалі для продажу 750 брашур з творамі А. С. Пушкіна (верагодна да юбілея паэта ў 1899 г.), якія ніхто не купляў з-за недахопу сродкаў, у выніку чаго было прапанавана бясплатна раздаць іх насельніцтву[3]. Па некаторых звестках з адкрыццём чайной № 2 звязана імя знакамітага доктара Івана Здановіча, на карысць гэтай версіі гаворыць тое, што І. Здановіч насамрэч быў членам Мінскага гарадскога камітэта папячыцельства аб народнай цвярозасці[4] і выбар месца для чайной – каля Губернскай земскай бальніцы, дзе ён працаваў. Аднак у захаваўшыхся дакументах імя І. Здановіча сярод загадчыкаў чайной не фігуруе.

Захар Шыбека паведамляе пра канспіратыўную кватэру ў доме Яхімовіча па адрасе Аляксандраўская, 21 (вугал вул. М. Багдановіча і Старажоўскай), дзе жыў да 1907 г. кіраўнік камуністаў-анархістаў Бяньκоўскі[5]. З пэўнай доляй упэўненасці можна казаць, што гэта тое ж месца, ці што ва ўладанні Яхімовіча знаходзілася некалькі будынкаў. Магчыма, што і народная чайная магла выкарыстоўвацца рэвалюцыянерамі для месца сустрэч.

Значную суму выдаткаў чайных складала арэнда. За памяшканне чайной № 1 папячыцельства плаціла (па даных 1905 г.) 500 руб. у год, за чайную № 2 – 420 руб. Трэба адзначыць, што мінскія чайныя ў гэтым плане абыходзіліся танней за Бабруйскую (600 руб.) і Слуцкую (550)[6].

Акрамя продажу гарбаты чайныя ажыццяўлялі продаж закусак і тытуню, аднак, як бачна з матэрыялаў справаздачы чайной № 1 за 1906 г., вялікай папулярнасцю яны не карысталіся (табл. 1). У справаздачы асобна вылучаецца продаж лімонаў, што для народных чайных было дастаткова экзатычнай з'явай. За адзначаны перыяд чайную наведалі 36 632 чал. (з якіх 2/3 складалі яўрэі

[1] НГАБ. Ф. 132. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 32.
[2] Тамсама. Спр. 18. Арк. 66.
[3] Тамсама. Спр. 37. Арк. 1–2.
[4] Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1902 год. Минск, 1901. С. 72.
[5] *Шыбека З. В.* Минскъ сто гадоў таму. Мінск, 2007. С. 258.
[6] НГАБ. Ф. 132. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 4.

і 1/3 хрысціяне)[1], калі паглядзець на колькасць порцый гарбаты (9158), то можна пабачыць, што адна порцыя прыходзіцца толькі на кожнага чацьвёртага. З аднаго боку, порцыі былі вялікімі і спажываліся часцей кампаніямі, але і значная колькасць наведвальнікаў не рабіла заказаў і не прыносіла прыбыткаў чайнай.

Т а б л і ц а 1. **Даходы Мінскай народнай чайнай № 1 за 1906 г.**[2]

| Артыкул даходу | Даход (у рублях) |
|---|---|
| Гарбата (9158 порцый) | 637,35 |
| Цукар дадатковы (5132 порцый) | 51,32 |
| Кіпень | 17,33 |
| Булкі | 31,79 |
| Папіросы | 8,28 |
| Лімоны | 4,17 |
| Закускі | 7,17 |
| Усяго | 757,41 |

У 1908 г. народная чайная № 1 дала 656,44 руб. прыбытку, пры выдатках у 1278,08 руб. (–51 %). Чайная № 2 дала яшчэ горшы паказчык – 787,23 руб., пры выдатках 1428,97 руб. (–55 %)[3], прычым тут была ніжэйшая арэндная плата. 24 красавіка 1909 г. Мінскі губернскі камітэт прыняў рашэнне ліквідаваць найбольш стратныя чайныя, у лік якіх трапіла чайная № 1[4]. Посуд і бібліятэку, якая існавала пры чайнай, перадалі ў чайную № 2, а астатнюю маёмасць было вырашана прадаць з таргоў. Аднак таргі так і не адбыліся, бо па словах аднаго з членаў камітэта: «на общественных торгах участвуют в основном евреи, которые, входя в сговор, занижают цену до минимума»[5]. У выніку маёмасць бязвыплатна перадалі Мінскаму дабрачыннаму таварыству. Але на гэтым непрыемнасці камітэта не скончыліся – дзеці Розенгауза, у чыім доме размяшчалася чайная запатрабавалі выплаціць грошы за арэнду за год цалкам (чайная была зачынена ў жніўні) і перадалі справу ў суд[6].

У той жа час скончыўся тэрмін арэнды дома Яхімовіч для чайнай № 2. Стан дома не вельмі падыходзіў не толькі для чайнай, але і ўвогуле для простага знаходжання: «дом ветхий, сырой и скоро рухнет»[7]. Разгледзеўшы некалькі варыянтаў – дом Ледера (вул. Аляксандраўская, 18) і дом Годера (вугал Георгіеўскай і Рынкавай плошчы)[8], камітэт вырашыў працягнуць кантракт з Яхі-

[1] НГАБ. Ф. 132. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 45.
[2] Тамсама. Арк. 28.
[3] Тамсама. Спр. 16. Арк. 4.
[4] Тамсама. Спр. 58. Арк. 45.
[5] Тамсама. Спр. 19. Арк. 63.
[6] Тамсама. Арк. 76.
[7] Тамсама. Спр. 18. Арк. 72.
[8] Тамсама. Арк. 69, 72.

мовіч, якая пагадзілася знізіць арэнду да 250 руб. у год і зрабіць за свой кошт рамонт[1].

Не менш заблытаная гісторыя была звязана і з кіраўніцтвам чайных. У 1909 г. загадчык народнай чайнай № 1 Яфім Шахаратаў, адстаўны калежскі саветнік ваеннага ведамства, удзельнік руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг., правізар-фармацэўт, спасылаючыся на занятасць прасіў вызваліць яго ад пасады. Новым загадчыкам чайнай стаў пратакаліст Мінскага дваранскага сходу Рыгор Харытановіч[2], але ўжо праз некалькі месяцаў чайная была ліквідавана, а імя Яфіма Шахаратава ўсплыло ў якасці загадчыка чайной № 2[3]. Тут яго дзейнасць выклікала незадаволенасць сядзеліцы Стэфаніды Валнянскай, якая ў 1910 г. падала ў камітэт скаргу, аб тым, што загадчык выкарыстоўваў казённыя дровы і керасін для сваіх патрэб, забраў дадому новыя рушнікі, замест якіх выдаў старыя анучы, забіраў свежыя нумары газет і вяртаў іх толькі праз некалькі дзён. Аднак у выніку даследавання звольнена была сама сядзеліца[4]. Напэўна і за Шахаратавым былі пэўныя правіннасці, бо ў красавіку 1911 г. яго адхілілі ад загадвання чайнай, а на яго месца быў прызначаны ўжо знаёмы нам Р. Харытановіч, які прабыў на пасадзе ўсяго месяц, і, спасылаючыся на далёкую адлегласць чайнай ад дому, адмовіўся ад кіраўніцтва. Да працы быў вернуты Я. Шахаратаў[5], але ўжо ў 1913 г. яго замяніў Іосіф Юрчык[6].

Праводзіліся ў чайнай і дабрачынныя акцыі. У 1912 г. з нагоды 100-годдзя вайны з Напалеонам у чайнай № 2 раздавалі танныя партрэты Аляксандра І і знакамітых расійскіх ваеначальнікаў[7], а з нагоды 300-годдзя дынастыі Рамановых ажыццяўлялася бязвыплатная раздача насельніцтву гарбаты на працягу 20 і 21 лютага 1913 г.[8].

У студзені 1914 г. газета «Русское слово» размясціла на сваіх старонках агляд стану папячыцельстваў аб народнай цвярозасці ў розных кутках імперыі. Мелася там і інфармацыя аб мінскай чайнай: «одноэтажный домик, выдающийся своим убожеством». Для наведвальнікаў выпісвалі мясцовую чарнасоценную газету (назва не ўзгадваецца) і пецярбургскую газету «Свет» (мела тую ж палітычную пазіцыю), а таксама часопісы «Ніва» і «Улей». Пры чайнай дзейнічала бібліятэка, дзе налічвалася каля 400 кніг[9]. Аб характары дадзенай літаратуры і аўтарах можна меркаваць па каталогу ліквідаванай бібліятэкі-чытальні пры чайнай № 1 (табл. 2).

---

[1] НГАБ. Ф. 132. Воп. 1. Спр. 21. Арк. 59.
[2] Тамсама. Спр. 17. Арк. 12.
[3] Тамсама. Спр. 58. Арк. 45.
[4] Тамсама. Спр. 21. Арк. 63–66.
[5] Тамсама. Спр. 30. Арк. 31.
[6] Тамсама. Спр. 43. Арк. 45.
[7] Тамсама. Спр. 35. Арк. 29.
[8] Тамсама. Спр. 38. Арк. 9.
[9] Тамсама. Ф. 299. Воп. 3. Спр. 1580. Арк. 3.

Т а б л і ц а 2. **Спіс кніг і часопісаў чытальні Мінскай народнай чайнай № 1 (1906 г.)**[1]

| Адзінка захоўвання | Колькасць асобнікаў |
|---|---|
| *Кнігі* | |
| М. Я. Салтыкоў-Шчадрын | 12 |
| Л. М. Талстой | 3 |
| Марк Твэн | 7 |
| А. К. Шэллер-Міхайлаў | 16 |
| К. М. Станюковіч | 12 |
| Генрых Гейне | 6 |
| І. Ф. Гарбуноў | 1 |
| М. С. Ляскоў | 12 |
| А. П. Чэхаў | 8 |
| *Часопісы* | |
| Ніва | 45 |
| Дадаткі да часопіса «Ніва» | 15 |
| Вокруг света | 1 |
| Дружеские речи | 1 |

Пачатак Першай сусветнай вайны ажывіў дзейнасць мінскай народнай чайнай. Гэта тлумачыцца як увядзеннем «сухога закона», так і вялікай колькасцю вайскоўцаў, якія праходзілі праз Мінск. Толькі ў лістападзе 1914 г. яе наведалі 11 956 чал.[2], што больш прыкладна 2 тыс. чал., чым колькасць наведвальнікаў чайнай за жнівень–снежань 1913 г.[3]. А даходы за другую палову 1914 г. склалі 1263,5 руб.[4], што ў сваю чаргу раўназначна гадавому даходу за 1913 г. цалкам[5].

Мінская народная чайная № 2 папячыцельства аб народнай цвярозасці функцыянавала да студзеня 1917 г., пакуль не была зачынена «по обстоятельствам военного времени»[6], з'яўляючыся на той момант адной з апошніх устаноў падобнага тыпу на тэрыторыі Беларусі.

Існаванне народных чайных было цікавай і неадназначнай з'явай у Расійскай імперыі. Гэтыя ўстановы, на думку ўлад, павінны былі стаць фінансава самастойнымі ва ўмовах нізкай плацежаздольнасці мэтавай аўдыторыі і значных сацыяльных функцый, якія на іх ускладаліся. У той жа час на сацыяльны эфект ад культурна-асветніцкай дзейнасці народных чайных аказвалі адмоўны ўплыў бюракратызм, палітычная ангажыраванасць кіраўніцтва і невысокі адукацыйны ўзровень насельніцтва.

---

[1] НГАБ. Ф. 132. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 22.

[2] Тамсама. Спр. 49. Арк. 55.

[3] Тамсама. Спр. 43. Арк. 41, 48, 50, 62, 65.

[4] Тамсама. Спр. 49. Арк. 32, 42, 50, 54, 61.

[5] Тамсама. Спр. 43. Арк. 1, 7, 11, 15, 22, 40, 48, 50, 62, 65.

[6] Тамсама. Спр. 49. Арк. 64.